№№170–171
(3300–3301)

29 кастрычніка—1 лістапада 2010 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

www.nv-online.info

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

ПАЛІТКУХНЯ

Мікалай ЛАЗАВІК:

«Чужыя грахі перад вачыма, а свае — за плячыма»

Пасля скандалу, у якім былі замешаны сябры ініцыятыўнай групы па вылучэнні кандыдатам у прэзідэнты лідара кампаніі "Гавары праўду!" Уладзіміра Някляева, шэрагі ягонай ініцыятыўнай групы паменелі...

Нагадаем, што Някляеў стаў першым і пакуль адзіным прэтэндэнтам у кандыдаты на прэзідэнцкі пост, які быў "узнагароджаны" папярэджаннем ад Цэнтральнай выбарчай камісіі. Падставай для такога рашэння сталі нібыта звароты абураных грамадзян, якія "завалілі" ЦВК агітацыйнай прадукцыяй прэтэндэнта Уладзіміра Някляева, выраблена ў мяжой. Адзначым, што доказаў таго, што гэтыя ўлёткі былі аддрукаваны і распаўсюджаны сябрамі ініцыятыўнай групы Някляева, дагэтуль няма.

Другой значнай прэтэнзіяй ЦВК да ініцыятыўнай групы Някляева стала тое, што збор подпісаў ажыццяўлялі непаўнагадовыя, якіх "завербаваў" невядомы, уручаўшы дзецям пасведчанні сябраў ініцыятыўнай групы паэта. Чалавека, які, пасутнасці, падставіў патэнцыйнага кандыдата ў прэзідэнты, ніхто не шукаў, але папярэджанне ініцыятыўнай групе Някляева вынеслі.

Пасля інцыдэнту кіраўнік ініцыятыўнай групы Някляева **Андрэй Дзмітрыеў** у размове з карэспандэнтам "Народнай Волі" сказаў, што будзе праведзена "ўнутранае расследаванне". Яно скончылася.

"Мы правялі жорсткую рэвізію ўнутры ініцыятыўнай групы і выявілі 77 чалавек, якія паставіліся да сваёй працы, мякка кажучы, абы-як. Намі быў складзены спіс з прозвішчаў гэтых людзей, ён перададзены ў ЦВК з просьбай аб тым, каб гэтыя людзі былі выключаны з маёй ініцыятыўнай групы, — расказаў Някляеў. — Больш за тое, у нас ёсць факты, што ў розных гарадах Беларусі па ўстановах і кватэрах ходзяць людзі, якія прадстаўляюцца сябрамі маёй ініцыятыўнай групы, хаця не маюць да гэтага ніякага дачынення. Гэта робіцца, я думаю, наўмысна, каб скласці фальшывыя спісы людзей, якія за мяне быццам бы падпісаліся".

Але не толькі з-за чысткі ўласных шэрагаў Уладзімір Пракопавіч адправіўся ў ЦВК. "Не адзін Някляеў грэшны, — гаворыць паэт. — Мы нясём у ЦВК дакументальныя, фота- і відэафакты парушэнняў, якія былі здзейснены сябрамі ініцыятыўнай групы магчымага кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі. Тут ёсць факты парушэнняў кшталту збору подпісаў на працоўных месцах, напрыклад, у дзіцячых садках, збор подпісаў людзьмі, якія не адносяцца да ініцыятыўнай групы Лукашэнкі і так далей. Будзем патрабаваць іх публічнага разгляду — так, як гэта было ў выпадку, калі выносілі папярэджанне ініцыятыўнай групе Някляева".

Патрабуй не патрабуй, але, як высветлілася, ніхто публічна не будзе "перамываць косткі" сябрам ініцыятыўнай групы Аляксандра Лукашэнкі. Бо гэта, аказваецца, нават не прадугледжана заканадаўствам.

Вось што з гэтай нагоды сказаў "Народнай Волі" сакратар ЦВК **Мікалай Лазавік.**

— У дадзеным выпадку ініцыятыўная група спадара Някляева паводзіць сябе па прынцыпе: чужыя грахі перад вачыма, а свае — за плячыма. У адпаведнасці з заканадаўствам, матэрыялы, якія прадстаўлены ў ЦВК сябрамі ініцыятыўнай групы Някляева, не патрабуюць калегіяльнага разгляду. І мы накіравалі адпаведны адказ заяўнікам. Хачу падкрэсліць: гэтая выбарчая кампанія, у прыватнасці, збор подпісаў, праходзіць лаяльна ў дачыненні да ініцыятыўных груп. Некаторыя з іх, праўда, літаральна ходзяць на мяжы фолу і глядзяць, як да гэтага паставіцца ЦВК, — праглыне чарговы выпад ці не. Асобныя патэнцыйныя кандыдаты праводзілі не пікеты, а цэлыя палітычныя дэманстрацыі. І вы не горш за мяне гэта ведаеце... Тым не менш мы вельмі беражліва ставімся ў тым ліку і да ініцыятыўнай групы Някляева... Хаця прэтэнзій можна было сабраць шмат...

— І ўсё ж такі, чаму "правіннасці Някляева" разбіралі публічна, а пры разборы матэрыялаў на ініцыятыўную групу Лукашэнкі ЦВК адмовілася ад такога разгляду?

— Папярэджанне, якое атрымала ініцыятыўная група Някляева, было ініцыявана насельніцтвам. Нам літаральна пачкамі прысылалі ўлёткі, якія выдаваліся за мяжой... А тое, што прынеслі прадстаўнікі ініцыятыўнай групы Някляева... Гэта нават няма неабходнасці разглядаць на пасяджэнні.

Падаецца, што са слоў вядомага юрыста Мікалая Лазавіка можна зрабіць толькі адну выснову: перад законам роўныя ўсе, але нехта ўсё ж такі больш роўны...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЦЫТАТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

"Беларусь рыхтуецца да важнейшай унутрыпалітычнай падзеі, — выбараў кіраўніка дзяржавы. Як дзеючы прэзідэнт хачу запэўніць, што зраблю ўсё ад мяне залежнае, каб яны прайшлі ў строгай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і сусветнымі стандартамі".

Ці верыце Вы ў гэта?

Алесь БЯЛЯЦКІ, кіраўнік зліквідаванага ўладамі праваабарончага цэнтра "Вясна":

— Не, не веру. Таму што ён ужо не аднойчы маніў на гэты конт. Ён збіраўся правесці чэсныя, справядлівыя выбары ў 2006 годзе, парламенцкія — у 2008-м, але, як паказала практыка, нягледзячы на запэўніванні, выбары праходзілі з парушэннямі і фальсіфікацыямі.

Як будзе на гэты раз — пакажа час, пакуль мы назіраем. Хацелася б памыліцца, але падаецца, што калі і насамрэч у Беларусі пройдуць свабодныя, чэсныя і справядлівыя выбары, то гэта будзе насуперак спадзяванням некаторых зацікаўленых асоб.

Аляксандр ФЯДУТА, палітолаг:

— Нацыянальнае заканадаўства — так, сусветныя стандарты — не.

Анатоль СІДАРЭВІЧ, старшыня Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада):

— Па-першае, хочацца заўважыць, што ні ад прэзідэнта краіны павінна залежыць, па якіх стандартах будуць праходзіць выбары. Прэзідэнт у гэтым працэсе павінен быць фігурай нейтральнай. Такой заявы не дазволіў бы сабе ні Клінтан, ні Сарказі. Падобная заява Лукашэнкі сведчыць толькі пра тое, што насамрэч у Беларусі няма выбараў.

Ці веру я ў тое, што Лукашэнка зробіць усё ад яго залежнае ў сэнсе правядзення дэмакратычных выбараў? Як пісаў расійскі класік: "Свежо предание, да верится с трудом..."

Зінаіда БАНДАРЭНКА, народная артыстка Беларусі:

— Не, не веру. Бо словы ў дадзеным выпадку разыходзяцца са справай. Насамрэч ціск адчуваюць многія людзі, якія асмеліліся пайсці на гэтыя выбары, апаніруючы дзеючаму кіраўніку. З іншага боку, а што ён павінен гаварыць? Словы Аляксандра Рыгоравіча аб тым, што ён згодны правесці выбары ў адпаведнасці з сусветнымі стандартамі, у першую чаргу разлічаны на заходнікаў. Але я не веру, што гэтыя выбары будуць адрозніваца па характары ад выбараў 2006 года.

Анатоль ПАЎЛАЎ, кіраўнік Мінскай гарадской арганізацыі Аб'яднанай грамадзянскай партыі, сябра кампаніі "За справядлівыя выбары":

— Не, не веру. Па-першае, таму што папярэдняя гісторыя правядзення выбараў у Беларусі сведчыць пра тое, што выбары не адпавядалі сусветным стандартам. Па-другое, вынікі фарміравання тэрытарыяльных выбарчых камісій гавораць пра тое, што прэзідэнцкія выбары ў нас не будуць свабоднымі. А па-трэцяе, калі ў склад кожнай з участковых выбарчых камісій не будзе ўключана хаця б па адным прадстаўніку ад апазіцыі, то ні пра якія сусветныя стандарты і гаварыць не варта... І апошняе: пра якія сусветныя стандарты можна гаварыць, калі выступленні кандыдатаў і дэбаты паміж імі будуць трансліравацца ў запісе.

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

ВІЗІТ

Дуня МІЯТАВІЧ:

«Зараз той час, калі беларускаму ўраду трэба рухацца наперад...»

Прадстаўніца АБСЕ па свабодзе сродкаў масавай інфармацыі Дуня Міятавіч засталася задаволенай сваім першым візітам у Беларусь. Спадарыня Міятавіч спадзяецца, што ён будзе не апошнім.

"Я вельмі шчаслівая, што ў мяне атрымалася прыехаць у Беларусь, — *падвяла вынік сваёй трохдзённай паездкі прадстаўніца АБСЕ па свабодзе СМІ.* — З вялікім інтарэсам сустрэлася і з прадстаўнікамі ўрада, і з прадстаўнікамі грамадзянскай супольнасці. Варта адзначыць, што адкрытае запрашэнне наведаць Беларусь я атрымала ад беларускага ўрада яшчэ на пачатку свайго мандату — для мяне гэта вялікі гонар. На мой погляд, гэта праява добрай волі для таго, каб распачаць доўгі працэс перабудовы заканадаўства ў сферы сродкаў масавай інфармацыі. І мяне падбадзёрыла тое, наколькі адкрыта высокапастаўленыя асобы вашай краіны абмяркоўвалі са мной складаныя пытанні ў сферы свабоды СМІ. Сустрэчы, якія адбыліся, прайшлі ў вельмі канструктыўнай манеры, і, я спадзяюся, так будзе працягвацца і далей".

Дуня Міятавіч прыняла ўдзел у "круглым стале", прысвечаным развіццю інтэрнэта ў Рэспубліцы Беларусь.

"Я ўзняла некаторыя складаныя пытанні, звязаныя з рэгуляваннем інтэрнэта: напрыклад, мяне клапоціць абавязковая ідэнтыфікацыя карыстальнікаў, — *гаворыць прадстаўніца АБСЕ.* — Мяне запэўнілі, што ў будучыні мой офіс і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці будуць прыцягваць да абмеркавання тых пастаноў, што ўжо існуюць, і тых заканадаўчых актаў, якія могуць быць прыняты. На ўсіх сустрэчах я выказвала занепакоенасць тымі праблемамі, якія, на мой погляд, павінны быць вырашаны неадкладна. Таксама вяла размову і пра тыя пытанні, да якіх трэба звяртацца доўга і сістэматычна, у тым ліку мы абмяркоўвалі шляхі мадэрнізацыі і лібералізацыі заканадаўства Беларусі, якое мае дачыненне да сродкаў масавай інфармацыі".

Дуня Міятавіч наведала рэдакцыю "Народнай Волі", сустрэлася з кіраўніцтвам Беларускай асацыяцыі журналістаў ***Жаннай Літвіной*** *і* ***Андрэем Бастунцом****, з міністрам замежных спраў* ***Сяргеем Мартынавым****, міністрам інфармацыі* ***Алегам Праляскоўскім****, начальнікам галоўнага ідэалагічнага ўпраўлення Адміністрацыі прэзідэнта* ***Усеваладам Янчэўскім,*** *а таксама старшынёй Цэнтрвыбаркама* ***Лідзіяй Ярмошынай****.*

"Плюралізм у СМІ ў Беларусі адсутнічае, — *выказала сваю думку спадарыня Міятавіч.* — Ён абмежаваны ў друкаваных сродках масавай інфармацыі і застаецца пад пагрозай у інтэрнэце. Таму я заклікала сваіх суразмоўцаў адмяніць усе адміністрацыйныя абмежаванні ў дачыненні да сродкаў масавай інфармацыі. Я адкрыта гаварыла, што практыка вынясення папярэджанняў газетам, як і практыка закрыцця газет, скоўвае дзейнасць прэсы і павінна быць неадкладна спынена. На мой погляд, у бліжэйшай будучыні заканадаўства ў сферы СМІ ў Беларусі павінна быць зменена. Мяне парадавала, што мы здолелі дасягнуць у гэтым пытанні прынцыповай згоды. Я прапанавала любую дапамогу вашаму ўраду. І падкрэслівала, што заканадаўства павінна не абмяжоўваць, а наадварот, спрыяць развіццю плюралізму ў СМІ".

Прадстаўніца АБСЕ па свабодзе СМІ заклікала распрацаваць Закон аб доступе да інфармацыі, а таксама тэрмінова адмяніць крымінальны пераслед за паклёп.

"Гэта першы крок, які можа зрабіць любая краіна, каб даць сваім грамадзянам свабодна выказвацца і жыць у свабодным грамадстве, пазбавіць іх ад крымінальнай адказнасці за паклёп, за нейкія правакацыйныя і крытычныя выказванні, — *гаворыць спадарыня Міятавіч.* — Паклёп не павінен падлягаць крымінальнаму перасследу, і журналісты не павінны сядзець у турме за сваё прамоўленае альбо напісанае слова. І не ва ўрадавых офісах, а ў судзе павінны разглядацца справы аб паклёпе".

У Дуні Міятавіч склалася ўражанне, што яе словы былі пачуты беларускім чынавенствам.

"Вельмі спадзяюся на тое, што мой візіт будзе новай старонкай у гісторыі стварэння свабодных СМІ ў Беларусі, — *кажа яна.* — Я буду і далей адсочваць сітуацыю ў Беларусі і буду ўздымаць свой голас, калі палічу гэта неабходным. Але я вельмі спадзяюся, што вынікі будуць. Зараз той час, калі беларускаму ўраду трэба рухацца наперад. У Беларусі павінны быць і плюралізм, і свабодныя СМІ..."

ТЫМ ЧАСАМ

Эксперты-крыміналісты АБСЕ не праводзяць уласнага расследавання смерці Алега Бябеніна

Яны толькі знаёмяцца з матэрыяламі крымінальнай справы загінуўшага журналіста.

Пра гэта паведаміў кіраўнік мінскага офіса АБСЕ **Бенедыкт Халер**.

"Двое экспертаў, якіх вызначыла наша штабкватэра ў Вене, цяпер працуюць у Мінску, — гаворыць кіраўнік офіса АБСЕ. — *Іх прыняў генеральны пракурор. Яны зараз вывучаюць усе матэрыялы, якія з'явіліся ў працэсе расследавання крымінальнай справы. Яны не праводзяць новае расследаванне, а пераглядаюць матэрыялы і фарміруюць сваё ўласнае ўражанне".*

Марына КОКТЫШ.

Александр Прушинский
(граф)

Претендент в президенты Беларуси в 1994 г.
Глава оргкомитета
по созданию Христианско-демократической
партии Республики Беларусь

СЕМЬ ШАГОВ К ПОБЕДЕ ОППОЗИЦИИ

1.Если мы хотим выиграть выборы, то необходимо, чтобы кандидаты собрались и выработали единую программу реконструкции страны.

2.Путем жеребьевки выбрали единого, который с общей программой стартовал бы в президентских выборах Республики Беларусь.

3.Чтобы поощрить оставшихся кандидатов к отказу от дальнейшего участия в выборах, единый кандидат должен пообещать в случае избрания президентом назначить их сенаторами.

4.Чтобы облегчить создание программы, предлагаю взять за основу мою программу, неоднократно поправленную и дополненную.

5.Единый кандидат от оппозиции сможет получить больше голосов, чем было бы отдано за всех вместе.

6.Если даже половина тех, кто хочет поддержать единого кандидата, пожертвовала бы по 2000 рублей для его кампании, то этого будет достаточно, чтобы выиграть.

7.Единый кандидат в президенты должен дать гарантию А.Г.Лукашенко насчет его безопасности в будущем с возможностью при желании свободно покинуть страну вместе с семьей.

Приглашаю всех возможных кандидатов оппозиции на встречу в "Сядзібу БНФ" 5 ноября 2010 г. в 11.00 (Минск, пр-т.Машерова, 8).

ЧП

Погуляли хлопцы?..

Четыре сотрудника спецподразделения "Стрела" ГАИ МВД были направлены по служебным делам в Сморгонский район. Первый ночлег провели на территории местного погранотряда. Но то ли условия их не устроили, то ли захотелось сменить строгую воинскую обстановку на более свободную, но уже на второй день они оплатили места в конно-спортивном центре "Гиппика", что под Ошмянами. В этом прекрасном месте отдыхали и спортсмены, и простые туристы, и священники, и банкиры, и ученые, однако, слава Богу, ничего чрезвычайного не происходило. Но тут...

По сведениям, поступившим в "Народную Волю" из Ошмян, на рассвете взвыла пожарная сигнализация, установленная в домике, в котором расположились самые главные блюстители порядка на дорогах. По рассказам очевидцев, спасаясь, двое сотрудников "Стрелы" выскочили из пламени в одном исподнем. Они бегали вокруг и кого-то звали...

Дом сгорел, 36-летний заместитель начальника службы эскортирования специального подразделения дорожно-постовой службы "Стрела" МВД РБ погиб в пожаре. В органах внутренних дел он — с сентября 1996 года, на этой должности — с марта 2010 года.

Понятно, отрабатывается несколько версий происшествия. Но "Народная Воля" склоняется к той, которую высказывают разные очевидцы и которые, говорят, зафиксированы представителями МЧС и медиками. Если эта версия подтвердится, то получается, что ребята хорошо погуляли...

В Ошмянах находится корреспондент "Народной Воли", и о результатах журналистского расследования читатели узнают в ближайших номерах.

Степан КИРИЧЕНКО.

БЕЛАРУСЬ—ЕЎРОПА

Еўракамісар прыедзе ў Мінск, але сустракацца з Аляксандрам Лукашэнкам не будзе

У бліжэйшыя дні камісар ЕС па пытаннях пашырэння і Еўрапейскай палітыкі суседства ***Стэфан ФЮЛЕ*** *наведае Мінск.*

Пра гэта сам Стэфан Фюле паведаміў на пасяджэнні Камітэта па пытаннях замежных спраў Еўрапарламента.

Еўракамісар сустрэч з Аляксандрам Лукашэнкам не плануе менавіта ў сувязі з тым, што 19 снежня ў нашай краіне павінны адбыцца прэзідэнцкія выбары, і такая сустрэча можа быць пададзена як падтрымка дзеючага кіраўніка.

Характарызуючы цяперашні стан адносін з Беларуссю, спадар Фюле сказаў, што асаблівага прагрэсу не бачыць. *"Усе адносіны з Беларуссю — гэта гісторыя страчаных магчымасцяў",* — зазначыў ён. І дадаў, што зараз мяч на баку Беларусі.

Маецца на ўвазе, што Еўропа чакае ад Беларусі правядзення свабодных і дэмакратычных прэзідэнцкіх выбараў.

ДЫПКУР'ЕР

Марэк Зюлкоўскі, магчыма, будзе новым амбасадарам Польшчы ў Беларусі

Прозвішча новага амбасадара Польшчы ў Беларусі ўсё яшчэ пакрыта таямніцай дыпламатычных пратаколаў.

Чакалася, што новы амбасадар прыедзе ў Беларусь напрыканцы кастрычніка — пачатку лістапада.

Аднак, па словах сакратара польскай амбасады ў Мінску Паўла Марчука, польскі бок усё яшчэ чакае атрымання агрэмана.

Новым амбасадарам Польшчы ў Беларусі, магчыма, стане цяперашні дырэктар Дэпартамента супрацоўніцтва дзеля прагрэсу пры Міністэрстве замежных спраў Польшчы — **Марэк ЗЮЛКОЎСКІ**. Раней дыпламат працаваў консулам у Генеральным консульстве Польшчы ў Мінску, а таксама амбасадарам Польшчы ва Украіне.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 кастрычніка—1 лістапада

СВОИМИ ГЛАЗАМИ

А город подумал...

Как только не называют теперь в Пинске понедельник, 25 октября. Многим он перечеркнул судьбы.

Этот день называют и черным, и зловещим, и прожженным... Впрочем, не столь важно, как его окрестить. Ясно только, что навсегда останется "черным пятном" в биографии "Пинскдрева". А, между прочим, коллектив готовился праздновать достопочтенный юбилей — 130-летие со дня основания. Планировались большие торжества, награды.

...Поначалу это был обычный понедельник, каких сотни в году. Вот только в обеденное время что-то уж сильно нахмурило. Горожане гадали: то ли туман, то ли смог какой-то? Очень резко потемнело. Где-то в 14 часов мне позвонил приятель со странным вопросом: все ли в порядке, все ли живы?.. Странность вопроса понял уже через минуту, когда узнал, что на "Пинскдреве" беда. Взрыв был такой силы, что люди на ближайшей автобусной остановке теряли сознание. А дальше дым, сирены пожарных и "скорые".

Телефоны работали, не умолкая. Все звонили и задавали тот же пугающий вопрос: у вас ничего не случилось? Весть о ЧП разносилась по городу от одного к другому, обрастая все новыми деталями и подробностями. Кто говорил о восьми жертвах, кто о тридцати. Именно столько работало в тот день в первую смену. Все громче звучал вопрос о выбросах в атмосферу, какой воздух в городе, нужны ли какие-то меры защиты и профилактики, как быть с детьми, которые сейчас на открытом воздухе? На вопросы никто не отвечал, хотя в городе есть радио, два канала телевидения — государственный и частный. Частный, между прочим, вечером 25-го крутил музыку, хотя все уже знали о трагедии. А смог между тем окутывал город. В воздухе ощущался тяжелый запах смол, еще каких-то веществ.

Пока пожарные профессионально делали свою работу, официальные лица молчали. А ведь что стоило произвести замер воздуха и уже через 1,5—2 часа успокоить людей, что опасности для здоровья нет, все в норме?

Первая информация о взрыве появилась на государственном телеканале "Пинск" лишь в 19.30. Диктор зачитала заготовленный текст пресс-службы МЧС, а далее показали сюжеты об экстренном совещании на "Пинскдреве", о том, как в горбольнице принимали пострадавших. И на следующий день люди узнали не больше. Городская газета "Пінскі веснік" опубликовала о взрыве лишь небольшую заметку. Никаких комментариев, ни одного снимка...

Сегодня город по-прежнему полнится слухами. А они всегда появляются там, где нет полной и конкретной информации. Людям она сегодня нужна, как никогда. И нужна уверенность в том, что от нас ничего не скрывают.

Андрей ПОЛХОВСКИЙ.

Пинск.

ВАКОЛ ТРАГЕДЫІ

Жах, які працягваецца...

Пацярпелыя ад выбуху і пажару на прадпрыемстве "Пінскдрэў" па-ранейшаму ў цяжкім стане...

Нагадаем, што здарэнне на пінскім прадпрыемстве адбылося ў панядзелак. Міністэрства па надзвычайных сітуацыях мяркуе, што прычынай пажару стаў выбух драўнянага пылу з-за парушэння правілаў эксплуатацыі абсталявання.

Пазаўчора ў Пінску пахавалі трох мужчын — 38-гадовага Ігара Мугу, 26-гадовага Яўгена Рапуту і 52-гадовага Міхаіла Старадуба. Па просьбе блізкіх грамадзянскай паніхіды не было.

Акрамя таго, стала вядома, што сем'і памерлых атрымаюць ад прадпрыемства па 10 мільёнаў рублёў (каля 3 тысяч долараў), пацярпелых — па тры мільёны (каля тысячы). Не густа, калі сказаць, што, напрыклад, сем'ям загінуўшых на ніжнетагільскай шахце "Ястюнинская" ў Расіі заплацілі па 70 тысяч долараў.

Пяцярых пацярпелых перавезлі ў Брэсцкую абласную бальніцу, семярых — у аддзяленне апёкавай рэанімацыі Бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі Мінска, астатнія — у Пінскай бальніцы. 27 кастрычніка ў Мінск з Брэста перавезлі яшчэ трох пацыентаў, такім чынам у Брэсце засталіся двое.

— У Мінск першых пацярпелых везлі на машынах "хуткай дапамогі", — распавяла "Народнай Волі" адна з супрацоўніц Мінскай станцыі хуткай дапамогі. — Здаецца, дзевяць машын адпраўлялі. У сталіцу людзей прывезлі ў дзве гадзіны ночы. А ў некаторых пацыентаў цела абгарэла аж на 80 працэнтаў! Але чаму мы класна працуем і гучна заяўляем аб гэтым, калі трэба дапамагчы камусьці за мяжой, і так ставімся да сваіх? Медыкі, якія везлі пацярпелых, проста абураліся. Гэта ж давезці людзей аж з Пінска ў Мінск — не блізкі свет! Няўжо не змаглі знайсці верталёт? У 80-я гады была санавіяцыя, і, калі нават камусьці адрывала руку, то пацыента дастаўлялі ў абавязковым парадку па паветры. А зараз усё разагналі. Гэта ж жах, везці людзей у такім стане па дарозе! Кожная хвіліна вырашальная. Блізкім пацярпелых зараз, можа, не да гэтага, аднак мы абураны.

Учора мы наведалі Мінскую бальніцу хуткай дапамогі. Медыкі ў асноўным не даюць ніякіх каментарыяў па пацярпелых, але галоўны ўрач **Віктар Іванавіч СІРЭНКА** адказаў на некалькі пытанняў.

— Што можна на сённяшні дзень сказаць аб стане пацярпелых?

— Цяжкі. Вельмі цяжкі... Сем пацыентаў знаходзяцца на апаратным дыханні.

— Колькі ў іх працэнтаў апёкаў?

— Па просьбе блізкіх мы такую інфармацыю не агучваем.

— Калі б пацярпелых прывезлі ў Мінск не на машынах "хуткай", а верталётамі, ці магло б гэта змяніць сітуацыю?

— Так. Але не ў лепшы бок. Яны б памерлі ў верталётах...

Што ж, спецыяліст, мабыць, ведае, як лепш было дастаўляць пацярпелых у сталіцу.

У сераду ў Пінску была аб'яўлена гарадская жалоба. Але не ў краіне. Як сумна пажартаваў хтосьці на форуме ў інтэрнэце: "Чакаюць, пакуль усе памруць?"

Алесь СІВЫ.

Прагноз ад Раманчука: долар будзе каштаваць 4500 рублёў

Калі ўрад рэалізуе план росту зарплат да 500 долараў, інфляцыя ў першым квартале наступнага года можа скласці 25—30%. Пра гэта ў інтэрв'ю БелаПАН заявіў прэтэндэнт на пасаду прэзідэнта эканаміст Яраслаў Раманчук.

"Уся эканамічная палітыка ўлад з'яўляецца заложнікам прэзідэнцкай кампаніі", — адзначыў Раманчук. Ён падкрэсліў, што Нацбанк пачаў актыўна друкаваць грошы, павялічваецца дэфіцыт бюджэту, крэдытаванне эканомікі працягваецца па інерцыі, але мадэрнізацыі эканомікі не адбываецца. *"Мы знаходзімся на мяжы макраэканамічнай дэстабілізацыі"*, — лічыць эканаміст.

Паводле слоў Раманчука, улады спадзяюцца, што да канца года не здарыцца сур'ёзных праблем у выглядзе абвалу курсу, росту цэн. *"Хоць ужо ў верасні інфляцыя склала 1,5%, што з'яўляецца рэкордам для гэтага года"*, — падкрэслівае ён.

Чаканым з'яўляецца і далейшае аслабленне беларускага рубля, які, паводле меркавання эканаміста, знаходзіцца пад пагрозай дэвальвацыі. *"Калі Нацбанк выканае свае намеры па павелічэнні грашовай масы на 40%, гэта абваліць курс"*, — перакананы ён. Паводле прагнозаў Раманчука, *"у выпадку вялікай грашовай экспансіі і пагаршэння гандлю з Расіяй курс можа вырасці да 4,5 тысячы рублёў за долар"*.

Эканаміст перакананы ў неабходнасці правядзення паўнавартаснага комплексу рэформ у галіне грашова-крэдытнай, бюджэтна-падатковай палітыкі, знешняга гандлю, прыватызацыі. *"Рашэнне ў эканамічнай сферы павінны прымаць кампаніі ў межах сваіх грошай, бюджэтаў, а не чыноўнікі"*, — заявіў Раманчук.

"Чым даўжэй мы будзем зацягваць з рэформамі, тым горшай будзе рабіцца сітуацыя", — лічыць ён.

Ці ёсць у Беларусі непісьменныя?

Ёсць. Як паведаміла "Еўрарадыё" са спасылкай на Пінскі аддзел статыстыкі, толькі на Піншчыне пражывае больш за тысячу непісьменных грамадзян.

Прычым толькі 177 з іх у горадзе, астатнія — у вёсках. У асноўным гэта сталыя людзі ці тыя, хто мае фізічныя абмежаванні і хранічныя захворванні.

ДИСКУССИЯ

Зачем в интернете паспорт?

*Директор Института проблем информационного права, доктор филологических наук **Андрей Рихтер** считает, что Беларусь должна отказаться от обязательной идентификации пользователей абонентских устройств и пользователей интернет-услуг.*

Об этом он написал в подробном комментарии к недавним документам, принятым в Беларуси по поводу использования национального сегмента сети интернет. Андрей Рихтер изучал белорусское законодательство, связанное с интернетом, по заказу Бюро представительства ОБСЕ по вопросам свободы средств массовой информации.

Как известно, в Беларуси поставщики интернет-услуг должны осуществлять идентификацию абонентских устройств пользователей, хранить информацию об оказанных интернет-услугах и предоставлять эти сведения в правоохранительные или иные государственные органы. Должны проходить обязательную идентификацию и посетители интернет-кафе. Эти заведения обязаны хранить персональные данные всех посетителей; сведения о времени начала и окончания оказания услуг; электронный журнал с данными обо всех доменных именах или IP-адреса интернет-ресурсов, с которыми пользователь осуществлял соединение. Предусмотрено предоставление этой информации органам, осуществляющим оперативно-розыскную деятельность.

Сегодня, как отмечают эксперты, количество посетителей в интернет-клубах сократилось в несколько раз.

По мнению **Андрея Рихтера**, принятие указа №60 *"О мерах по совершенствованию использования национального сегмента сети интернет"* делает незаконным и невозможным анонимное получение и распространение информации. И делает доступной информацию об интернет-корреспондентах и интернет-источниках журналиста без согласия на то самого журналиста и его источника конфиденциальной информации. Введенные правила об обязательной идентификации абонентских устройств и пользователей интернет-услуг ведут к необоснованным ограничениям права гражданина на получение и распространение информации.

Между тем представители Оперативно-аналитического центра при президенте Республики Беларусь не видят ничего страшного в том, что при визите в интернет-кафе нужно предъявлять паспорт или любой другой документ с фотографией, идентифицирующей личность. В конце концов люди оставляют свои паспортные данные при покупке билетов, при регистрации в отелях.

"Электронные ящики и блоги не требуют регистрации, — отмечали представители ОАЦ. — *И сегодня в Беларуси нет ни одного сайта, в том числе оппозиционного, доступ к которому был бы запрещен"*.

Замначальника Управления по раскрытию преступлений в сфере высоких технологий МВД Беларуси **Игорь Пармон** утверждает, что по IP-адресу невозможно установить, какие странички просматривал клиент интернет-кафе — мол, техническа это просто невыполнимо.

"А если невозможно, то зачем вообще нужна идентификация пользователей? — переспросил **Андрей Рихтер**. — *В чем смысл этой нормы? Так придется носить паспорт с собой всегда и везде. А удобнее всего паспортные данные носить на спине — чтобы всем видно было. Любой человек имеет право на защиту своих интересов от государства. Поэтому требование обязательной идентификации интернет-пользователей ограничивает права человека"*.

Один из участников "круглого стола" привел конкретный пример: сотрудники правоохранительных органов задержали мошенника, который, сняв квартиру на пару суток, умудрился сдать ее 12 нуждающимся одновременно. Объявление о срочной сдаче жилплощади горепредприниматель разместил на одном из сайтов, зарегистрировавшись, кстати, в интернет-кафе. Так его и вычислили...

Кстати, основатель и владелец крупнейшего белорусского интернет-портала TUT.BY **Юрий Зиссер** заметил, что, например, в Италии в интернет-кафе применяется менее болезненная для пользователей мера идентификации — видеосъемка. И паспортные данные там не требуются.

У Андрея Рихтера также вызывает сомнения *"правомерность полного запрета на размещение на сайтах государственных органов и организаций информации, содержащей сведения, составляющие государственные секреты"*.

"Такие документы должны предоставляться при условии изъятия из них той части, в которой наличествуют секреты", — говорит авторитетный эксперт.

Андрей Рихтер настоятельно рекомендует Беларуси: *принять во внимание существующие международные инструменты борьбы с преступлениями в интернете; отказаться от обязательной идентификации пользователей абонентских устройств и пользователей интернет-услуг; уточнить смысл и порядок введения ограничений и запретов на распространение незаконной информации, уточнить ответственность за необоснованность запретов; предоставить определять, какая информация представляет вред судебным органам, а не органам исполнительной власти; предусмотреть обязанность государственных органов информировать в интернете не только о собственной деятельности, но и делиться с обществом информацией, полученной или созданной в результате этой деятельности; предусмотреть обязанность размещения в интернете документов после изъятия из них секретной и иной запрещенной законом к разглашению информации, а также возможность раскрытия информации в случае преобладания общественного интереса.*

Будут ли выполнены рекомендации авторитетного эксперта — покажет время.

ТЕМ ВРЕМЕНЕМ

В Беларуси планируется принять закон, устанавливающий административную ответственность за нарушения в сети интернет.

Об этом на "круглом столе" "Белорусский сегмент сети интернет: проблемы и перспективы" заявил представитель Оперативно-аналитического центра при президенте **Сергей Кравцов.**

По словам чиновника, законопроект уже разработан и внесен в правительство.

Марина КОКТЫШ.

АСОБА

Аляксандр НАДСАН:

«Дзе ж ваша пачуццё годнасці, беларусы?»

Днямі апостальскі візітатар для беларусаў-каталікоў у замежжы Аляксандр Надсан наведаў Беларусь. Ён прысутнічаў на прэзентацыі кнігі, якую яму прысвяцілі сто навукоўцаў, пісьменнікаў, тэолагаў і мастацтвазнаўцаў з 14 краін свету.

Аляксандр Надсан жыве ў Лондане з 1946 года. Не проста знайшоў там сябе, а стаў знакавай постаццю для Беларусі. Размаўляючы з айцом Надсанам, я спрабавала знайсці адказ на многія пытанні...

— Эмігранты, з якімі даводзілася сустракацца, казалі, што першыя пасляваенныя гады ўсе былі перакананыя, што камуністы хутка сыдуць і можна будзе вярнуцца на Бацькаўшчыну. І што толькі потым прыйшло разуменне, што ўсё значна горш. А як заставацца ў краіне і ведаць, што можаш ніколі не ўбачыць сваіх бацькоў, родных?

— Канечне, гэта вельмі цяжка. Тады Саветы разгарнулі такую прапаганду, агітавалі ехаць на Радзіму, абяцалі залатыя горы. Але большасць эмігрантаў не верылі ім, бо ўжо былі сведчанні пра тое, як абыходзіліся з тымі, хто вяртаўся.

У мяне ў тыя гады быў сябар, якога я ўгаворваў не ехаць. А ён кажа: "У мяне мама хворая, і я павінен ёй дапамагаць". І як я ні адгаворваў, колькі ні тлумачыў, што нікому не будзе лепей, калі яго сашлюць на Калыму, ён усе ж такі паехаў. Вось так і атрымалася, што паехаў фактычна транзітам, бо яго адразу арыштавалі — і на Калыму. Быў ён у лагеры, пакуль Сталін не памёр. А мама яго памерла, так і не дачакаўшыся сына. Вось і маме не дапамог, і сам здароўе сваё згубіў... Але вярнуцца хацелася ўсім.

— Калі ж адбыўся ваш першы прыезд у Беларусь?

— У 1990-м я прывёз лекі. Але тады не было часу, каб паехаць на радзіму, у Гарадзею. У свой родны горад трапіў толькі ў 1992 годзе. Там некаторыя месцы не змяніліся, а некаторыя не пазнаць. Знайшоў свой дом. Гаспадароў не было, суседзі сказалі, што яны на працы... Я не стаў чакаць. Навошта?..

— Цяпер вам удаецца калі-нікалі бываць на радзіме. Што кідаецца ў вочы? Ці мяняецца сітуацыя неяк прыкметна, бо збоку лепш відаць.

— Так. Я б сказаў, што ў другой палове 90-х панавала нейкая антыбеларускасць. Пачынаеш гаварыць па-беларуску, на цябе неяк глядзяць з агрэсіяй. А цяпер — не. Я вось вымушаны быў набыць кепку, і пайшлі мы ў такі вялікі ўнівермаг "Беларусь". І я размаўляў па-беларуску, але ніхто не здзівіўся, ніхто не сказаў, што не разумее. Зараз абсалютна спакойна можна размаўляць, і ніякіх праблем. Значна горш тое, што называецца **абыякавасць.** Людзей больш турбуе, дзе набыць пральную машыну... Жыццё, канечне, паляпшаецца. Але трэба разумець, што было б дзіўна, калі б яно пагаршалася.

І ўсё ж самае галоўнае, што вырасла добрая, свядомая моладзь. Гэта вельмі важна. А побытавыя праблемы — гэта другаснае...

— Прапаганда палохае, што на Захадзе жыццё горшае, асабліва кепска пенсіянерам.

— Вось я пенсіянер. У Англіі на пенсію і мужчыны, і жанчыны выходзяць ва ўзросце 60 гадоў. Пенсіянеры маюць бясплатны праезд аўтобусам на ўсёй тэрыторыі Англіі. Нават калі я еду ў аэрапорт на цягніку, то мне налічваюць грошы за квіток з улікам таго, што да мяжы горада я мушу ехаць бясплатна, і возьмуць толькі ад мяжы да аэрапорта. Таму я плачу не 15 фунтаў, а толькі 3. Калі я захварэю, то лекі даюць бясплатна, хаця яны дорага каштуюць. Бясплатны выклік урача, бясплатны шпіталь, бясплатная аперацыя. Можа, гэта таму, што ў Лондане жыве больш за 9 мільёнаў чалавек, а на горад толькі адзін лядовы стадыён, і нікому ў галаву не прыходзіць будаваць паўсюды лядовыя палацы?..

— Што можна пажадаць беларусам?

— Трэба паслядоўна пры ўсіх абставінах пачынаць гаварыць па-беларуску. Ідзеш у якую-небудзь установу ці ў краму — гавары па-беларуску. Цябе зразумеюць, не бойся. Можа, нехта скрывіцца, але зразумее. Не чакайце, што нехта загадае, пачынайце з сябе. Мяне вельмі здзівіла, што толькі пару сем'яў у Магілёве дабіліся таго, што іх дзеці пойдуць у беларускі садок. І гэта на ўвесь вялікі горад. Ну, калі ўлады дазволілі, то дзе ж гэтыя беларусы? Хто ж тады вінаваты, што нічога беларускага няма? Я не кажу, што ўлады не вінаватыя, але дзе ж вы? А сітуацыя ў Гродне?.. Нават калі ўлады дазволілі, то на сто тысяч жыхароў не змаглі знайсці дзесяць сем'яў, якія хацелі б вучыць дзяцей у беларускіх класах. А калі будуць беларускамоўныя класы ў школе, то з іх пачнецца беларускі ўніверсітэт. Тады ў ім будзе патрэба, тады ён з'явіцца, і сотні дзяцей стануць студэнтамі, беларускамоўнымі спецыялістамі... І далей, далей... Не трэба чакаць, калі ўлады для цябе нешта зробяць. Часам даходзіць да смешнага — прыязджаюць міністры, якія валодаюць беларускай мовай. Сядзіць перакладчык і з англійскай мовы перакладае на рускую, а потым дае адказ англійскаму міністру па-руску. Я ўжо раззлаваўся і кажу: "Што ж ты робіш? Англічанам, якія не ведаюць ні рускай, ні беларускай, наплываць, на якой ты мове гаворыш. Дзе ж тваё пачуццё годнасці?!" Вось дзе бяда! Быў у Францыі на навуковай канферэнцыі. Сядзіць перакладчык. Нашы навукоўцы па-беларуску гавораць. А перакладчык перакладае ім па-руску... У нас комплекс непаўнавартасці: маўляў, з замежным панам трэба гаварыць на панскай мове. А нармальны чалавек мусіць мець хаця б пачуццё годнасці. Адмова ад роднай мовы — гэта пачатак непавагі да сябе. Калі пачынаюць гаварыць "Мы славяне..." — усё, гэта канец. Дык і чэхі ж славяне, але яны ж пішуць "чэх", а не "славянін". Некалі Гітлер хацеў, каб усе шведы і нарвежцы былі германцамі. Так і тут са славянамі... Трэба быць беларусам. Гэта вельмі важна. Бо будзе пачуццё сваёй годнасці, і не трэба будзе ні перад кім кланяцца.

Любоў ЛУНЁВА.



Нарадзіўся Аляксандр Надсан у сям'і настаўніка ў Гарадзеі 8 жніўня ў 1926 годзе. Вучыўся ў гімназіі, а падчас нацысцкай акупацыі скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю.

У 1944 годзе, як і сотні прадстаўнікоў інтэлігенцыі, з'ехаў у эміграцыю. Спачатку ў Францыю, дзе стаў удзельнікам Руху супраціўлення. Потым ваяваў у другім Польскім корпусе генерала Андэрса і быў паранены пад Монтэ-Касіна. У 1953 годзе скончыў матэматычны факультэт Лонданскага ўніверсітэта. У гэты час ён заснаваў Згуртаванне беларусаў Вялікабрытаніі. У 1958 годзе прыняў святарскае свячэнне. Стаў дырэктарам школы-інтэрната імя Кірылы Тураўскага пры каталіцкай місіі. Пазней, у 1971 годзе, стварыў і стаў кіраўніком знакамітай бібліятэкі імя Ф.Скарыны ў Лондане. Айцец Надсан з 1989 года з'яўляецца старшынёй Беларускага камітэта дапамогі ахвярам радыяцыі ў Вялікабрытаніі.

Аляксандр Надсан — аўтар больш за 250 навуковых публікацый, кніг па гісторыі Беларусі і гісторыі беларускага хрысціянства. Яго малітоўнік "Госпаду памолімся", выдадзены ў 2002 годзе, стаў афіцыйным тэкстам набажэнстваў Беларускай грэка-каталіцкай царквы.

Ліквідаваны ўчастак, на якім на мясцовых выбарах перамог апазіцыйны кандыдат

Баранавіцкі гарвыканкам ліквідаваў выбарчы ўчастак №34, на якім падчас выбараў дэпутатаў мясцовых Саветаў 25 красавіка 2010 года перамог апазіцыйны кандыдат Аляксандр Галькевіч.

Участак №34 месціўся ў памяшканні будаўнічага ўпраўлення "83 УНР". Менавіта тут Аляксандр Галькевіч перамог прадстаўніка мясцовай улады, галоўнага рэдактара афіцыйнай мясцовай газеты "Наш край" Міхаіла Шубіча, і стаў дэпутатам гарадскога Савета. Па выніках падліку галасоў старшыня ўчастковай камісіі — кіраўнік ААТ "83 УНР" Уладзімір Кунік смела заявіў: "На гэтым участку сумленнем не гандлююць. Ніхто і ніколі".

Ужо тады было цікава: ці ўзначаліць спадар Кунік участковую камісію на прэзідэнцкіх выбарах і якія будуць вынікі падліку галасоў на гэтым участку. Як высветлілася, не ўзначаліць і ўчастка для галасавання не будзе.

Народная Воля http://www.nv-online.info
29 кастрычніка—1 лістапада

НЕДВИЖИМОСТЬ

Борьба за квадратные метры

Квартирный вопрос волнует сотни тысяч людей. Журналистка «Народной Воли» побывала на нескольких столичных и пристоличных стройках и узнала, как и за сколько можно улучшить жилищные условия в Минске и его окрестностях. Прежде чем говорить о том, что предлагает отечественный рынок жилья, стоит отметить, что сегодня все квартиры можно разделить на несколько видов: бюджетные, средний класс и элитные.

РАЙ В ШАЛАШЕ

«Зеленый Бор» приглашает...

Не секрет, что самое дешевое жилье находится за пределами столицы. Города-спутники становятся все более привлекательными не только для жителей регионов, которые хотят перебраться ближе к Минску, но особенно для молодых семей. Для них важнее соотношение цены и качества, нежели престижность района.

Ставку на молодые семьи сделали застройщики квартала **"Зеленый Бор"** в Боровлянах. По плану в комплекс должно входить 15 домов, среди которых будут торговый центр, школа и детский сад, который построят в 2013 году. Сегодня уже семь зданий введено в эксплуатацию. Многие жилые дома уже не только сданы, но и заселены.

Что касается инфраструктуры, то Боровляны могут похвастаться своей благоустроенностью. Тут есть и магазины, и парикмахерские, в сентябре открылась новая школа. Если нет своего автомобиля, до города довезет автобус или маршрутка.

Застройщик, УП "Дамаан", сегодня предлагает здесь одно-, двух- и трехкомнатные квартиры. Большинство из них небольшие — одна или две комнаты от 37,34 до 62,40 м2, трешки стандартные — 79,16 м2. Квартиры не очень большие из-за того, что они предлагаются как первое жилье для молодежи. Большинство покупателей берут квартиры в льготный кредит либо покупают жилищные облигации все по тем же кредитам. При этом застройщики "Зеленого Бора" не занимаются долевым строительством.

Квартира	Цена 1 м2 по жилищным облигациям	Цена 1 м2 в готовых квартирах
1-комнатные	2 млн 750 тыс. руб. (примерно 900 у.е.)	3 млн 100 тыс. руб. (примерно 1тыс. у.е.)
2-комнатные	2 млн 630 тыс.руб. (примерно 870 у.е.)	2 млн 990 тыс. руб. (около 1 тыс. у.е.)
3-комнатные	2 млн 550 тыс.руб. (примерно 820 у.е.)	Нет в наличии

Плюсы

Квартиры можно купить уже с готовой отделкой. Достаточно выбрать понравившиеся материалы из предложенных "Дамааном", внести необходимую сумму и подождать два месяца. Квартира будет полностью подготовлена к приему жильцов.

Одним из преимуществ жизни в квартале "Зеленый Бор" можно назвать хорошую экологию и приятный вид из окна на сосновый лес. Недалеко расположились самые известные белорусские базы отдыха — горнолыжный центр "Силичи" и горнолыжный спортивно-оздоровительный комплекс "Логойск".

Жильцы образовали свое товарищество собственников и сами выбирают фирмы, которые будут заниматься уборкой мусора, проводить ремонт и другие работы.

Уровень безопасности "Зеленого Бора" может послужить примером для других: квартал будет огорожен, а въезд закрыт шлагбаумом. Кроме того, в качестве бесплатного бонуса от застройщика — в квартале установлены камеры наблюдения. Каждый житель может настроить на своем телевизоре дополнительные шесть каналов, которые будут показывать происходящее на детской площадке, парковке и в других местах.

Если уж речь пошла о парковке, то стоит отметить, что вся территория квартала уже полностью пригодна для жилья. Обустроены площадки для игр, автостоянки и даже места для велосипедов.

Минусы

Боровляны — не самый близкий город-спутник Минска. Если вы работаете в одном из отдаленных спальных районов столицы, добираться до работы придется довольно долго. Да и с транспортом в "Зеленом Бору" ситуация пока не лучшая, о троллейбусе или трамвае приходится только мечтать.

Кроме того, Боровляны не подойдут тем, кто ведет активный образ жизни. "Зеленый Бор" — квартал для молодых семей, вряд ли он понравится тому, кто любит проводить свободное время в бассейнах, барах и клубах.

Немаловажным фактором для многих является и то, что в одном населенном пункте помещается сразу несколько больниц.

"Зеленый Бор" в Боровлянах.

Жилой комплекс «Славный» в Слободе

Громкое название "Славный" пока, как мне кажется, не соответствует реальности. Многоподъездный пятиэтажный домик вырос на краю строительной площадки, которая развернулась на окраине поселка Слобода Смолевичского района. Компания "Городстрой" занялась возведением жилого дома на одной площадке с домами ЖСК, который свои пятиэтажки строит для льготников из Смолевич. Стоит отметить, что здания совершенно одинаковые, но "Городстрой" свои 80 квартир предлагает на продажу.

Строительство находится на заключительной стадии — осталось только благоустроить территорию и завершить черновую отделку. Все работы будут закончены в ноябре.

Дом в поселке Славный строят дольщики — в основном жители Минска. Кроме того, несколько квартир отдано льготникам из Смолевичского района. На продажу в почти готовом доме осталось всего 13 двухкомнатных квартир и 23 трехкомнатные. Руководство компании "Городстрой" не сомневается, что в скором времени и это жилье раскупят. Тем более что в перспективе рядом с уже возведенными домами появится еще две 60-квартирные пятиэтажки.

Что касается метража, то однокомнатные квартиры занимают 41,6 м2, двухкомнатные — от 56,3 до 61м2, трехкомнатные — от 77 до 79 м2.

Квартира	Долевое строительство
1-комнатные	2 млн 700 тыс.руб. (около 900 у.е.)
2-комнатные	2 млн 700 тыс.руб.
3-комнатные	2 млн 700 тыс.руб.

Плюсы

Дом сдается с черновой отделкой, это значит, что в вашей квартире будут оштукатурены стены, поставлен унитаз и трехкамерные стеклопакеты, подведено электричество с установкой выключателей и розеток. При этом стоит отметить вполне удачную планировку квартир от "Городстроя".

Неоспоримым плюсом жилья в Славном будет нагревательная газовая колонка в каждой квартире. Горячая вода для жителей будет не благом, а само собою разумеющимся плюсом.

Это единственный коммерческий дом в Смолевичском районе, и цены в нем ниже, чем в других пригородных новостройках.

В перспективе, Смолевичи должны стать полноправным городом-спутником. Он разрастется до кургана Славы. Эта земля уже выделена для коттеджной застройки. Ближе к Смолевичам будут возводиться многоэтажки.

Минусы

Льготники из Минска не смогут приобрести квартиру в Славном пользуясь своими привилегиями. Минчане, которые стоят на учете по улучшению жилищных условий, в пригороде льготниками не считаются. Придется ждать своей очереди в столице. Единственный выход — выписаться из минской квартиры и прописаться в Смолевичском районе, но на такие комбинации находиться мало охотников.

Все дома одинаковой планировки — ничем особенным ваше жилье отличаться не будет. Лифт в плане дома не предусмотрен. Придется добираться наверх своим ходом, что не совсем подходит для молодых семей с маленькими детьми.

К тому же территория вокруг Славного пока далека от идеала и инфраструктура уступает тому же "Зеленому Бору".

ЗАДЕЛ НА БУДУЩЕЕ

Многофункциональный комплекс «Минск-Сити»

